*57. Сынкова, I. А.* Мастацтва ўсходняй аправы: беларускія калекцыі ў кантэксце мусульманскай пераплётнай традыцыі / I. А. Сынкова // Беларуская кніга ў кантэксце сусветнай кніжнай культуры: гісторыя і сучаснасць : зб. навук. прац / Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў ; склад.: Л. І. Доўнар, Т. А Самайлюк. – Мінск, 2011. – С. 307–322.

*58. Цітавец, А. І.* Арабаграфічныя рукапісы канца XVII – першай паловы XX ст. – крыніцы для вывучэння духоўнай культуры татараў Беларусі : аўтарэф. дыс. ... канд. гіст. навук : 07.00.09 / А. І. Цітавец ; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2009. – 23 с.

*L. DOUNAR*

## THE BELARUSIAN BOOK HISTORY AS THE MODERN BIBLIOLOGICAL RESEARCH OBJECT

*The main trends and tendencies of the Belarusian book history development as the bibliological research object in modern Belarus, which, in retrospect, had a close relationship with the humanities, such as history, literature, linguistics, art history, philosophy, pedagogy, culturology, as well as with related disciplines – bibliography and library science are considered.*

*The problematic issues are analyzed and the new methodological approaches to the study of the Belarusian book and bibliology history are revealed; their paradigmatic orientation to such category as a book culture is noted. Attention to the issue of the institutional research in the Central Scientific Library of the National Academy of Sciences of Belarus, the National Library of Belarus, the Belarusian State University of Culture and Arts is paid.*

Дата паступлення артыкула ў рэдакцыю: 01.10.2014.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

УДК 001.4:[002.2+004.08+37]-027.21

*Т. С. ЮХНАВЕЦ*

## АДУКАЦЫЙНЫЯ ІНФАРМАЦЫЙНЫЯ РЭСУРСЫ: ДА ПЫТАННЯ ВЫЗНАЧЭННЯ СУТНАСЦІ

*Аналізуюцца азначэнні паняцця адукацыйных інфармацыйных рэсурсаў, прыведзеныя ў працах вучоных і спецыялістаў розных галін ведаў. Абазначаны падыходы да трактоўкі тэрмінаў «адукацыйны інфармацыйны рэсурс», «інфармацыйна-адукацыйныя рэсурсы», «адукацыйныя інфармацыйныя рэсурсы» і інш. Звяртаецца ўвага на азначэнне паняцця электронных адукацыйных рэсурсаў. Робіцца вывад аб асноўных падыходах да азначэння тэрмінаў «адукацыйныя інфармацыйныя рэсурсы», «электронныя адукацыйныя рэсурсы» і іх сутнасці.*

На сучасным этапе развіцця грамадства ключавая роля належыць ведам. Да гэтага прыводзяць, у першую чаргу, імклівыя тэмпы змяненняў тэхнікі і тэхналогій у свеце. Сітуацыя складваецца такім чынам, што менавіта ад развіцця адукацыі ў будучым залежыць лёс цывілізацыі.

Аналіз асноўных ідэй і напрамкаў мадэрнізацыі сістэмы адукацыі выяўляе наступную заканамернасць: у сістэмах адукацыі ўсіх форм і ўзроўняў павышаная ўвага надаецца праблемам стварэння, фарміравання і выкарыстання інфармацыйных рэсурсаў, якія выступаюць як стратэгічны рэсурс развіцця адукацыі. Матывам, які абумоўлівае дадзеную заканамернасць, выступае той факт, што адукацыя мае інфармацыйную прыроду, таму што адбываецца трансляцыя культурнай інфармацыі, назапашанай папярэднімі пакаленнямі, наступным пакаленням.

Нягледзячы на ўстойлівы інтарэс да вырашэння праблемы стварэння, фарміравання і выкарыстання інфармацыйных рэсурсаў, не ў поўнай меры вырашаны пытанні фармалізацыі і адназначнасці паняццяў вылучанай прадметнай сферы. Сярод іх – паняцце адукацыйных інфармацыйных рэсурсаў (АІР), якое ў апошнія гады шырока выкарыстоўваецца не толькі прадстаўнікамі педагагічнай галіны, але і іншых галін ведаў.

Неабходна адзначыць, што ў дачыненні да гэтага паняцця назіраецца тэрміналагічная разнастайнасць, нараўне з тэрмінам «адукацыйныя інфармацыйныя рэсурсы» ўжываюцца тэрміны: «інфармацыйныя рэсурсы адукацыі», «інфармацыйныя адукацыйныя рэсурсы», «інфармацыйна-адукацыйныя рэсурсы», «інфармацыйныя рэсурсы адукацыйнага прызначэння» і інш. Прычым усе прыведзеныя тэрміны ўжываюцца як у форме множнага, так і адзіночнага ліку.

Адзначаная сітуацыя, несумненна, патрабуе выяўлення сутнасці тэрмінаў з мэтай распрацоўкі адзінага дакладнага тэрміна і дасягнення аднастайнасці ў яго разуменні. Усё гэта будзе садзейнічаць упарадкаванню паняційнага апарату сучаснай навукі і яе развіццю.

Аналіз азначэнняў паняцця АІР выяўляе шэраг падыходаў, якія ляжаць у іх аснове, і, у сувязі с гэтым, сэнсавыя адрозненні дэфініцый.

З пазіцый кагнітыўнага падыходу паняцце АІР разглядаецца ў вузкім і шырокім сэнсе слова. АІР у вузкім сэнсе слова – гэта веды, гатовыя для мэтазгоднага сацыяльнага выкарыстання, гэта значыць адчужаныя ад носьбітаў (індывідаў) і заключаныя ў матэрыяльную форму. АІР у шырокім сэнсе слова ўключаюць усе адчужаныя ад носьбітаў і ўключаныя ў інфармацыйны абмен веды, якія існуюць як у вуснай форме, так і ў матэрыялізаванай. Напрыклад, Д. Л. Цітароў пад інфармацыйна-адукацыйнымі рэсурсамі разумее «сукупнасць ведаў, сабраных і структураваных па пэўных правілах і з ужываннем спецыяльных тэхналогій, якія забяспечваюць стварэнне, падтрымку, распаўсюджванне і доступ да інфармацыйна-адукацыйных рэсурсаў»* [16, с. 4]. Уключэнне ў склад такога азначэння працэсаў збору і ўпарадкавання ведаў паказвае на яго прыналежнасць да групы вузкасэнсавых дэфініцый.

Мае месца разуменне АІР, якое складваецца на падставе існуючых трактовак больш агульнага паняцця інфармацыйных рэсурсаў. К. М. Грыцэнка і А. В. Бацішчаў выводзяць азначэнні адукацыйных інфармацыйных рэсурсаў пры дапамозе дэфініцыі тэрміна «інфармацыйныя рэсурсы», прыведзенай у Федэральным законе Расійскай Федэрацыі «Аб інфармацыі, інфарматызацыі і абароне інфармацыі» [12]. Паводле меркавання А. В. Бацішчава, «адукацыйныя інфармацыйныя рэсурсы – сукупнасць даных у асобных дакументах і асобных масівах дакументаў, дакументах і масівах да-

* Цытаты прыводзяцца ў перакладзе аўтара артыкула.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кументаў, арганізаваных у інфармацыйных сістэмах, для задавальнення адукацыйных патрэб карыстальнікаў інфармацыйнай сістэмы» [3, с. 12]. К. М. Грыцэнка прапануе разглядаць адукацыйны інфармацыйны рэсурс як «дакумент (сукупнасць дакументаў), прызначаны для прадстаўлення адукацыйных інфармацыйных паслуг» [5, с. 3]. У той жа час такі падыход з'яўляецца дакументным. Немалаважнай складальнай дадзеных азначэнняў з'яўляецца аспект функцыянальна-мэтавага прызначэння дакументаў – задавальненне інфармацыйных патрэбнасцей карыстальнікаў адукацыйнага характару.

Падобную да вышэйпрыведзеных дэфініцый дае трактоўку тэрміна «інфармацыйны адукацыйны рэсурс» Я. А. Ваграменка. Пад ім ён разумее «дакумент (сукупнасць дакументаў), які прызначаны і самастойна афармлены для распаўсюджвання сярод неабмежаванага кола асоб або служыць асновай для прадстаўлення інфармацыйных паслуг» [4, с. 27]. Аднак аспект функцыянальна-мэтавага прызначэння дакумента тут пазначаны недастаткова адназначна і выразна. У ходзе аналізу разваг аўтара высвятляецца, што пад інфармацыйным адукацыйным рэсурсам разумеецца як першасны, так і другасны дакумент (каталог, пошукавая сістэма і г. д.). Пры гэтым да дакументаў, якія прызначаны для распаўсюджвання, Я. А. Ваграменка адносіць першасныя дакументы, а да дакументаў, якія служаць асновай для прадстаўлення інфармацыйных паслуг, – другасныя. На наш погляд, такое разуменне першасных і другасных дакументаў неправамерна. Любыя першасныя і другасныя дакументы, якія функцыянуюць у грамадстве, прызначаны для распаўсюджвання ў прасторы і часе. І, што важна, не толькі другасны, але і першасны дакумент можа быць асновай для аказання інфармацыйных паслуг.

Дакументна-эканамічны падыход пакладзены ў аснову азначэння адукацыйнага інфармацыйнага рэсурсу ў рабоце А. В. Ісаева. Аўтар разумее пад ім дакументы, у тым ліку неапублікаваныя (справаздачы аб навукова-даследчых работах, дэпаніраваныя рукапісы, дысертацыі і інш.). Пры гэтым «карпаратыўныя і ведамасныя матэрыялы (даведкі, расклады заняткаў, вучэбныя планы, ведамасці, сертыфікаты і інш.)», на думку А. В. Ісаева, не ўваходзяць у паняцце «адукацыйны інфармацыйны рэсурс». Такі рэсурс павінен валодаць прыкметамі закончанасці і самастойнасці і ўяўляць «прадукт, прызначаны для распаўсюджвання сярод нявызначанага кола асоб, для якіх ён прадстаўляе цікавасць, гэта значыць мае спажывецкую каштоўнасць», за плату або бязвыплатна ў неабмежаваным рэжыме [10, с. 51–52].

Больш шырокія азначэнні АІР, у параўнанні з вышэйразгледжанымі трактоўкамі, прыводзяцца з пазіцый інфармацыйнага падыходу. Так, напрыклад, Б. М. Сізоў і Т. С. Маркарава інфармацыйна-адукацыйныя рэсурсы трактуюць як «сукупнасць навукова-педагагічнай, вучэбна-метадычнай, хрэстаматыйнай, нарматыўна-тэхнічнай і інструктыўнай інфармацыі, да якой забяспечаны доступ карыстальнікаў, дыферэнцыраваны па ролі і месцы ўдзельніка адукацыйнага працэсу, а таксама магчымасць здабывання інфармацыйнага рэсурсу ў адпаведнасці з асобаснымі асаблівасцямі і перавагамі карыстальніка» [15]. У дадзеным азначэнні раскрываецца відавы склад інфармацыі, якая ўтварае інфармацыйна-адукацыйныя рэсурсы. Названыя віды інфармацыі дазваляюць заўважыць, што інфармацыйна-адукацыйныя рэсурсы ўключаюць інфармацыю, прызначаную як для навучэнца, так і для таго, хто навучае.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Вылучаецца падыход, згодна з якім аўтары зводзяць азначэнне АІР да ўказання іх значных уласцівасцей, прыкмет, магчымасцей; да раскрыцця іх структуры, прызначэння, класіфікацыі і г. д., гэта значыць не гавораць пра сутнасць гэтых рэсурсаў. А. Ю. Забалотнава, разглядаючы паняцце «геаграфічны інфармацыйны адукацыйны рэсурс», вызначае яго «як інфармацыйны рэсурс, які выкарыстоўваецца ў працэсе навучання геаграфіі, які валодае наступнымі магчымасцямі: візуалізацыя інфармацыі аб прыродных і сацыяльна-эканамічных аб'ектах, якія функцыянуюць у прасторы і ў часе; мадэляванне гэтых аб'ектаў у дынаміцы іх развіцця; аўтаматызацыя працэсаў пошуку, збору, апрацоўкі, захоўвання, перадачы і тыражавання інфармацыі, у тым ліку прасторава-каардынаванай, аб геаграфічных аб'ектах і з'явах, што вывучаюцца» [9, с. 4]. Структуру гэтых рэсурсаў утвараюць інфармацыйныя рэсурсы адукацыйнага прызначэння (электронныя падручнікі, энцыклапедыі, даведнікі і г. д.) і прафесійныя інфармацыйныя рэсурсы (лічбавыя карты і атласы, касмічныя здымкі, геаінфармацыйныя сістэмы, базы даных і г. д.), «якія могуць быць выкарыстаны настаўнікам геаграфіі ў сваёй прафесійнай дзейнасці» [9, с. 5]. Адзначаныя аўтарам аспекты дазваляюць зрабіць выснову, што, па сутнасці, геаграфічны інфармацыйны адукацыйны рэсурс – гэта дакументы ў галіне геаграфіі, пададзеныя ў электроннай форме і прызначаныя для навучэнцаў і настаўнікаў. Гэта, у сваю чаргу, паказвае, што А. Ю. Забалотнава разумее яго з пункту гледжання дакументнага падыходу. Такога ж падыходу прытрымліваецца і Н. М. Аюшава. Аднак, на наш погляд, яна не дастаткова карэктна вылучае дзве часткі інфармацыйных адукацыйных рэсурсаў: «…адну частку інфармацыйных адукацыйных рэсурсаў складаюць паўнатэкставыя дакументы, якія з'яўляюцца электронным прадстаўленнем папяровых выданняў, а другую частку – праграмныя прадукты, рэсурсы Інтэрнэт і т. п.» [2, с. 2]. Тут узнікае шматзначнае разуменне крыніц, якія ўтвараюць другую частку: можна лічыць, што яе ўтвараюць электронныя паўнатэкставыя дакументы, якія не маюць папяровых аналагаў; або ў яе ўваходзяць як арыгінальныя паўнатэкставыя дакументы, так і другасныя дакументы; або тут прадстаўлены толькі другасныя дакументы. Больш таго, такое дзяленне рэсурсаў выклікае пытанне: «Сярод рэсурсаў Інтэрнэт не можа быць паўнатэкставых дакументаў, якія з'яўляюцца копіямі папяровых дакументаў?» Адказ на яго відавочны.

Па меркаванні С. А. Севасцьянавай, інфармацыйны адукацыйны рэсурс – комплексны сродак навучання, які складаецца з пяці кампанентаў: арыенціровачны (вучэбны план, рабочая праграма вучэбнага курса па пэўнай дысцыпліне, кваліфікацыйныя патрабаванні па спецыяльнасці і інш.); змястоўны (электронны падручнік, электронны канспект лекцый, практыкумы і інш.); кантрольны (тэставыя заданні розных відаў і інш.); даведачна-інфармацыйны (табліцы, формулы, спасылкі на сайты і інш.); навуковы (рэфераты, даклады на студэнцкіх навуковых канферэнцыях, тэмы навуковых распрацовак кафедры і інш.) [14]. Такая трактоўка сведчыць аб дакументным падыходзе да азначэння паняцця. Пад інфармацыйным адукацыйным рэсурсам С. А. Севасцьянава разумее электронныя дакументы, якія носяць не толькі вучэбны, але і даведачны, і навуковы характар.

Такім чынам, аналіз выяўленых трактовак паняцця АІР дазволіў вылучыць шэраг падыходаў і, адпаведна, паказаць сутнасць АІР з пункту гле-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

джання кожнага з іх. Акрамя таго, падчас аналізу выявілася ўстойлівая тэндэнцыя трактоўкі АІР як крыніц інфармацыі менавіта на электронных носьбітах. І гэта цалкам абумоўліваецца іншай тэндэнцыяй – актыўным укараненнем і выкарыстаннем на працягу апошніх гадоў у адукацыйнай практыцы камп'ютарных інфармацыйных тэхналогій, стварэннем адкрытых адукацыйных сістэм, інтэрактыўнага адукацыйнага асяроддзя і інш. Вынікам адзначаных тэндэнцый становіцца з'яўленне такіх тэрмінаў, як: «адукацыйныя электронныя рэсурсы», «лічбавыя адукацыйныя рэсурсы», «інтэрактыўныя размеркаваныя адукацыйныя рэсурсы», «размеркаваны інфармацыйны рэсурс адукацыйнага прызначэння», «адукацыйныя электронныя інфармацыйныя рэсурсы» і інш. Гэтыя тэрміны ўжо ўвайшлі ў лексіку розных прафесійных груп і часта сустракаюцца ў спецыяльнай літаратуры. Падыходы да іх азначэння большай часткай тыя ж, што і падыходы да трактоўкі паняцця АІР.

Некаторыя аўтары, грунтуючыся на дакументным падыходзе, адзначаюць форму і функцыянальна-мэтавае прызначэнне адукацыйных электронных рэсурсаў (АЭР), але пры гэтым не ўдакладняюць ступень іх распаўсюджанасці і даступнасці, што вядзе да пытання аб магчымасцях іх выкарыстання. Так, А. У. Елісеева і С. М. Злобіна пад тэрмінам «лічбавыя адукацыйныя рэсурсы» разумеюць «інфармацыйныя крыніцы ў лічбавым выглядзе, якія могуць быць выкарыстаны ў вучэбна-выхаваўчым працэсе як адзінае цэлае» [7 с. 57]. На думку В. А. Пурышавай, «электронныя адукацыйныя рэсурсы як раз і ўяўляюць сабой усю сукупнасць матэрыялаў, неабходных у адукацыйным працэсе для выкарыстання якіх патрэбныя электронныя прылады» [13, с. 95]. А. А. Аксюхін і Д. М. Грыбкоў сцвярджаюць, што «электронны вучэбны рэсурс прадстаўлены ў лічбавай форме асобнымі дакументамі і асобнымі масівамі дакументаў вучэбнага і навуковага прызначэння, дакументамі і масівамі дакументаў у інфармацыйных сістэмах вучэбнага і навуковага прызначэння» [1, с. 269].

У прыведзеных азначэннях прасочваецца разыходжанне ў поглядах аўтараў адносна функцыянальна-мэтавага прызначэння электронных крыніц інфармацыі, якія з'яўляюцца АЭР: у адным выпадку – гэта крыніцы вучэбнага прызначэння, у другім – дыяпазон крыніц шырэй і ўключае дакументы вучэбнага, навуковага і іншага прызначэння.

Дакументны падыход ляжыць у аснове дэфініцыі і такога тэрміна, як «адукацыйныя электронныя выданні і рэсурсы». Аднак, на наш погляд, азначэнне дадзенага тэрміна і, адпаведна, яго назва патрабуюць некаторых удакладненняў і карэкціроўкі.

Адразу неабходна адзначыць, што розніца паміж тэрмінамі «выданне» і «рэсурсы» на гэты час нідзе не зафіксавана. Паводле меркавання Л. Ф. Насейкінай, «электронныя выданні і рэсурсы – тэрмін, які аб'ядноўвае электронныя выданні на носьбітах інфармацыі і інфармацыйныя рэсурсы ў камп'ютарных сетках. У сваю чаргу, электронныя адукацыйныя выданні і рэсурсы – гэта электронныя выданні і рэсурсы, прызначаныя для выкарыстання ў любых адукацыйных мэтах» [11, с. 248]. Аўтар лічыць, што падручнік, прадстаўлены на здымным носьбіце інфармацыі (напрыклад, аптычным дыску, карце памяці) з'яўляецца электронным выданнем, а калі гэты ж падручнік прадстаўлены толькі на сайце ўстановы ў сетцы Інтэрнэт, то ён ужо з'яўляецца рэсурсам. Да рэсурсаў Л. Ф. Насейкіна такса-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ма адносіць Web-старонкі, сайты і базы даных, размешчаныя ў сетцы Інтэрнэт. З нашага пункту гледжання, такі падзел інфармацыйных крыніц неправамоцны, перш за ўсё, з-за двух абставін. Па-першае, агульнавядома, што асноўнымі прыкметамі выдання з'яўляюцца рэдакцыйна-выдавецкая апрацоўка і тыражаванне дакумента, а не матэрыяльны носьбіт і нават не яго форма. Па-другое, сёння дакументы публікуюцца ў тэлекамунікацыйных сетках, яны праходзяць рэдакцыйна-выдавецкую апрацоўку і становяцца электроннымі выданнямі. Акрамя таго, трактоўка тэрміна «рэсурс» як крыніцы чаго-небудзь або сродку [8] паказвае на тое, што «рэсурс» – больш агульнае паняцце і «паглынае» тэрмін «выданне». Такім чынам, каб пераадолець неадназначнасць і недакладнасць у разуменні разглядаемага тэрмінаспалучэння, тэрмін «выданні» з яго неабходна выключыць.

У ходзе тэрміналагічнага аналізу выявіўся і культуралагічны падыход. Так, В. В. Гура называе электронным адукацыйным рэсурсам «частку культурнай дзейнасці, зафіксаванай на электронным носьбіце, якая ўпарадкавана ў адпаведнасці з педагагічнымі мэтамі і служыць для задавальнення інфармацыйна-адукацыйных патрэбнасцей суб'ектаў адукацыйнага працэсу (студэнтаў, выкладчыкаў, адміністрацыі)» [6, с. 199]. У гэтай трактоўцы выразна выказана мэтавая накіраванасць культурнай дзейнасці.

Такім чынам, у аснове выяўленых азначэнняў паняцця АІР ляжаць розныя падыходы: кагнітыўны, дакументны, інфармацыйны і інш. У той жа час большасць аўтараў трактуюць дадзенае паняцце з пункту гледжання дакументнага падыходу: пад АІР разумеюць дакументы, прызначаныя для задавальнення інфармацыйных запатрабаванняў адукацыйнага характару. Тэндэнцыя актыўнага ўкаранення ў адукацыйную практыку камп'ютарных інфармацыйных тэхналогій абумоўлівае тэндэнцыю разумення АІР менавіта як электронных крыніц інфармацыі адукацыйнага прызначэння і, у сваю чаргу, з'яўленне паняцця АЭР, якое трактуюць, грунтуючыся ў асноўным на дакументным падыходзе. АЭР разглядаюць як дакументныя крыніцы ў электроннай форме, прызначаныя для дасягнення адукацыйных мэт.

---


1. *Аксюхин, А. А.* Классификация электронных информационных ресурсов в сфере образования / А. А. Аксюхин, Д. Н. Грибков // Информатизация образования – 2012 : материалы Междунар. науч.-практ. конф., Орел, 18–21 июня 2012 г. / Орл. гос. ун-т ; Акад. информатиз. образования ; Ин-т информатиз. образования РАО. – Орел : ОГУ, 2012. – С. 269–272.

2. *Аюшева, Н. Н.* Исследование и разработка моделей и методов поиска информационных образовательных ресурсов в электронной библиотеке : автореф. дис. … канд. техн. наук : 05.13.11 / Н. Н. Аюшева ; Моск. гос. техн. ун-т им. Н. Э. Баумана. – М., 2004. – 16 с.

3. *Батищев, А. В.* Проблемы управления качеством образовательных информационных ресурсов / А. В. Батищев // Изв. ОрелГТУ. Сер. : Информ. системы и технологии. – 2008. – № 1–4/269(544). – С. 12–13.

4. *Ваграменко, Я. А.* О направлениях информатизации российского образования / Я. А. Ваграменко // Системы и средства информатики. – М. : Наука : Физматлит, 1996. – Спец. вып. 8. – С. 27–38.

5. *Гриценко, Е. М.* Управление процессами жизненного цикла образовательных информационных ресурсов : автореф. дис. … канд. техн. наук : 05.13.01 / Е. М. Гриценко ; Сиб. гос. технол. ун-т. – Красноярск, 2005. – 21 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*6. Гура, В. В.* Теоретические основы педагогического проектирования личностно ориентированных электронных образовательных ресурсов и сред / В. В. Гура. – Ростов н/Д : Изд-во Юж. федер. ун-та, 2007. – 320 с.

*7. Елисеева, Е. В.* Цифровые образовательные ресурсы как составляющая инновационной образовательной среды современного вуза / Е. В. Елисеева, С. Н. Злобина // Вестн. Брян. гос. ун-та. – 2010. – № 1. – С. 56–60.

*8. Ефремова, Т. Ф.* Новый словарь русского языка : толково-словообразовательный : в 2 т. / Т. Ф. Ефремова. – 2-е изд., стер. – М. : Рус. язык, 2001. – Т. 2. П–Я. – 1084, [1] с.

*9. Заболотнова, Е. Ю.* Методические подходы к использованию географического информационного образовательного ресурса и к разработке авторских приложений учебного назначения (на примере обучения студентов и повышения квалификации учителей географии) : автореф. дис. … канд. пед. наук : 13.00.02 / Е. Ю. Заболотнова ; Рос. акад. образования, Ин-т информатиз. образования. – М., 2008. – 19 с.

*10. Исаев, А. В.* Типы информационных образовательных ресурсов / А. В. Исаев // Изв. Волг. гос. техн. ун-та. – 2008. – Т. 5, № 5. – С. 50–52.

*11. Насейкина, Л. Ф.* Применение электронных образовательных изданий и ресурсов как компонентов развития информационно-образовательной среды университета / Л. Ф. Насейкина // Вестн. Оренб. гос. ун-та. – 2011. – № 2. – С. 248–253.

12. Об информации, информатизации и защите информации : федер. Закон Рос. Федерации, 20 февр. 1995 г., № 24-ФЗ : в ред. федер. Закона от 10.01.2003 г., № 15-ФЗ. – М. : Омега-Л, 2006. – 23 с.

*13. Пурышева, В. А.* Роль электронных ресурсов в управлении системой современного образовательного процесса / В. А. Пурышева // Электронные ресурсы в непрерывном образовании : тр. II Междунар. науч.-метод. симпозиума «ЭРНО – 2011», Анапа, 18–21 сент. 2011 г. / М-во образования и науки Рос. Федерации [и др.]. – Ростов н/Д : Пед. ин-т ЮФУ : Дубинин, 2011. – С. 94–97.

*14. Севастьянова, С. А.* Информационный образовательный ресурс: структура, содержание, применение в учебном процессе / С. А. Севастьянова // Вестн. Моск. гос. пед. ун-та. Сер. : Информатика и информатизация образования. – 2006. – № 6. – С. 172–173.

*15. Сизов, Б. Н.* Информационно-образовательные ресурсы ГНПБ им. К. Д. Ушинского: состояние и перспективы развития / Б. Н. Сизов, Т. С. Маркарова // Библиотеки и информационные ресурсы в современном мире науки, культуры, образования и бизнеса : тр. Двенадцатой Междунар. конф. «Крым 2005», Судак, 4–12 июня 2005 г. [Электронный ресурс] / ГПНТБ России. – 2005. – Режим доступа: http://gpntb.ru/win/inter-events/crimea2005/disk/119.pdf. – Дата доступа: 24.12.2012.

*16. Титарев, Д. Л.* Инструментарий формирования сетевых информационно-образовательных ресурсов экономики, основанной на знаниях : автореф. дис. … канд. эконом. наук : 08.00.13 / Д. Л. Титарев ; Моск. гос. ун-т экономики, статистики и информатики. – М., 2004. – 23 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*T. YUKHNOVETS*

## TO THE QUESTION OF DEFINING THE ESSENCE OF EDUCATIONAL INFORMATION RESOURCES

*The analysis of the definitions of educational information resources contained in the writings of scholars and specialists in various fields of knowledge is presented. Approaches to the interpretation of the terms "educational information resource", "informational and educational resources", "educational information resources", etc. are designated. Attention to the definition of electronic educational resources is paid. The conclusion about the basic approaches to the definition of the terms "educational information resources", "e-learning resources" and their essence is made.*

Дата паступлення артыкула ў рэдакцыю: 06.05.2014.

УДК 02(091)(476)"19.../1917"+02(092)Хлебцевич

*М. Б. ПОЖАРИЦКИЙ*

## ДЕЯТЕЛЬНОСТЬ Е. И. ХЛЕБЦЕВИЧА В ОБЛАСТИ ОРГАНИЗАЦИИ И УПРАВЛЕНИЯ БИБЛИОТЕКАМИ (дореволюционный период)

*Целью статьи является анализ деятельности Евгения Хлебцевича в области организации и управления библиотеками в дореволюционный период. Впервые на примере научной и практической работы Е. И. Хлебцевича рассматривается действие принципов и приемов библиотечной организации и библиотечного управления при создании бесплатных народных библиотек в сельской местности в начале XX в., определяются место и роль этих библиотек в предлагавшейся просветителем модели сети земско-общественных библиотек. Делается вывод о значимости его вклада в становление организации и управления библиотечным делом.*

Евгений Иванович Хлебцевич (1884–1953) – литературовед, публицист, политик, но в первую очередь библиотековед и библиограф, является родоначальником многих библиотечных процессов и явлений. Е. И. Хлебцевич вел активный поиск путей и способов предоставления книги массовому читателю, внес лепту в организацию и управление библиотеками на концептуальном и прикладном уровнях.

Изучением жизни и деятельности Е. И. Хлебцевича занимались Г. М. Семашкевич [17; 18], В. Е. Леончиков [8], М. И. Покало [14], В. В. Скалабан [19; 20], А. М. Петкевич [15; 16], М. Б. Пожарицкий [9; 11; 13], С. Н. Чигрин [33]. Материалы о нем размещены в биобиблиографическом словаре «Беларускія пісьменнікі» [3], энциклопедиях [21; 22]. Однако публикации о Е. И. Хлебцевиче носят общий обзорный характер. Отсутствуют работы, посвященные той или иной конкретной проблеме, касающиеся его деятельности.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ